Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г. 2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г—4 р. на 6 мес—2 р. 3 мес.—1 р. Пераменa адрэсу—20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрам. Рукапісы і карэспандэнціі, прысланыя у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто не прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рукапісы аўторам не вертаюцца назад.

Год VIII. | 12 Верэсьня 1913 г. | № 37

## Беларуская кнігарня

**і выдавецтво, Беларускаго календара.**

**Вільня, Завальная 7**

**Высылае беларускіе,** і на ўсіх іншых мовах кніжкі, якіе есць у прадажы; прыймае падпіску на ўсе газэты, якіе выходзяць у Расеі. Для людзей працуючых над навукай і пазнаньнем нашаго краю вышуківае і дастаўляе кніжкі датычачые гісторыі, этнографіі, этнолёгіі і філёлогіі беларускай; прыймае да друкаваньня беларускіе кніжкі:

**Беларускіе кніжкі** высылае накладной платай без задатку, на кніжкі у іншых мовах, прысылаючы заказ, трэба прысылаць і 1/3 часць задатку.

## ГОЛАС СУМЛЕНЬНЯ!

Кожын з нас чытаў і чуў аб тым, як часам голас сумленьня адзываецца у людзей, як тые людзі у доўгую ноч ня могуцьуснуць, як жывой зьявай перад вачамі іхнімі перэвіваюцца мары споўненых крыўд, як у такіе мінуты найцьвярдзейшые людзі каюцца, сівые закамянелые старцы плачуць... Як голас сумленьня мучыць і яны тады гатовы выступіць са шчырым словам, с праўдзівым абвінавачэньнем сябе самых.

Голас сумленьня час ад часу будзіцца ня толькі у душах асобных людзей але і ў душы націй. У час ночы, калі загнаная праўда, закрыўшы далонямі вочы хаваецца у найдалейшы закутак, а крыўда пануе, калі заместа голасу справядлівых, чыстых душой і сэрцам грамадзян і барцоў за праўду, лунаюць крыкі пьяных безпраўем, прадажных людзей, — у такіе цёмные момэнты жыцьця народоў адзываецца голас сумленьня і ные сэрцэ у тых, хто пачувае на сабе, на сваім народзе правіны і з набалеўшай народнай душы вырываецца самобічуючый стогн. Німа споркі аб тым, што Расея перэжывае цяпер час ночы, цемраву панаваньня ваюючаго націоналізму. І вось у гэтай цемраве, нідалей, як колькі дзён таму назад разданіся такіе словы голасу сумленьня, з вуст правых расейцоў:

„Мы самі, распаляем Мазэпінства, — пішуць яны у дакладнай запісцы,—прыціскаючы украінскую культуру, мы самі творым непрыязьнь, сваркі, паміж аднэй сямьі, адбіраючы права на мову, літэратуру, тэатр у 30 мільённаго народу, прыкідаючыся сумысьля дурнямі і угаварываючы, што мова украінская „мужыцкая“, што гэта ня мова, а «тарабаршчына, створэная Грушэўскім», што гэта ня мова, а адміраючый „правінціоналізм“, прыдуманый прыдурнаватымі хлопоманамі» і т. д. і т. д., што украінскай мовы „німа, не было і ня будзе“.

«Украінская мова была ёсць і будзе; пярэчыць гэтаму могуць або людзі саўсім незнаёмые з Украінай, або «перакінчыкі», паламаўшые сваю народнасць, парваўшые ўсякую звязь з націанальным жыцьцём свайго племені, свядомые, або не сьвядомые атступнікі ад свайго роднаго. «Дармо будзіць мерцьвяцоў», „мёртвые не ўваскрэсаюць“... Гэта праўда, але-ж украінская мова жыве, яе ешчэ не забілі,—і ці добрае дзела хараніць жывых, і ці пустая работа ратаваць і ажыўляць прыдушэных, але ешчэ не задушэных, вызваляць нявінна паланённых, тых што мучацца, але ешчэ не сцятых, не замучэных на сьмерць?

...«Украінскі народ хочэ толькі сваей мовы і сваей гісторыі у сваей украінскай школе.. Украінцы не чужакі, а нашы родные браты і іх не павінны аграгічываць у развіваньні мовы і націанальнай іхняй культуры.

...Цяжка думаць, што дагэтуль,—ў імя бюракратычных і саўсім мёртвых ідэалоў «абрусеньня»,—багатая, прыгожая і паэтычная Украіна прыгаворэна на выраджэньне, атупеньне і павольнае уміраньне»...

Гэтак гаворыць голас сумленьня вустамі лепшай, бо справядлівай часткі правых, вустамі князя праваслаўнай цэркві, епіскопа Нікона, дапутата IV Гас. Думы.

Епіскоп Нікон падае у Думу праект закону, каб Украінцам пазволілі вучыцца па ўсіх школах у свхей роднай мове, каб у гэтые школы назначэны былі вучыцелямі украінцы, каб па цэрквах казаньня былі па украінску. Ці голасу гэтаго паслухае расейскае грамадзянство? Лепшая, справеддівая частка расейскаго грамадзянства была заўсёды у барадзьбе з няпраўдай, на старане праўды, але прадажные пісакі і наёмные палітыканы, паднімуць толькі гоман, выкарыстаюць шчыры голас сумленьня на цкаваньне проці Украінцоў. Мы, беларусы, с практыкі ведаем, як кожнае нашэ шчырае слова, розные Солоневічы, Кавалюкі і ім падобные, стараюцца перэкруціць і выкарыстаць на зло нам, як без сьледа сораму, на выцертых тварах прыпісываюць нам гэтые паны «мазэпінства», «польскую інтрыгу», як арудуючы крупельскімі довадамі сыпяць на нас абвінавачэньня у каторых мы не павінны, даходзячы пры гэтым да бязглудзіцы, як прымерам апошняе выступленьне «Россіі» каторая убачыла за беларускай справай: жыдоў, касьцёл, соціалізм і польскую інтрыгу. А якая грубасць, якая некультурнае не паважаньне чужой сьвятыні вее у аплёвываньні нашай мовы, каторую, грубые, прадажные тые людзі абзываюць «тарабаршчынай», «выдуманым жаргонам», польскім воляпюком», «мужыцкой галдой» і інш. Карыстаючыся тым, што над звязаным і кінутым на зямлю можна безкарна здзекавацца, яны здзекуюцца, глумяцца над нашым гонарам націанальным.

Мы верым, што праўда і сумленьне запануюць с часам на сьвеці, але нам здаецца, што голас сумленьня на гэты раз замрэ. Расея знае ужо гістарычные раскаіваючыеся тыпы (знае іх і ўвесь сьвет, усе народы). Пасьля кожнаго раскаяньня Іоанна грознаго наступалі новые пыткі, новае бушэваньне апрычыны. Во і цяпер ужо чуваць, што еп. Нікона сынод не пусьціў у Пецярбург. Што будзе пакажэ час, а пакуль што вядома толькі адно: сумленьне прамовіло.

**Юры Верэшчака.**

## Выстаука у Вільні.

Як ужо нашым чытачам ведама, першаго верэсьня, у Вільні атрылася выстаўка хатніх вырабоў і народнаго штукарства. Выстаўка мае мэту паказаць, што і як вырабляецца у нашым краю, як народ нашаго краю (беларусы і літвіны) разумеюць красу, як гэту красу выражаюць у вытворах сваіх рук і свайго розуму; што ёсць у нашым краю цікаваго і арыгінальнаго, годнаго развіцьця і паказу на шырокім сьвеці. Адным словам мэта выстаўкі—паказаць, што мы патрапім зрабіць і як зрабіць. Выстаўка займае вялікую двохпаверхную Гарадзкую Залу. Найбольш на выстаўку панасылалі рознаго тканьня, немала вырабоў з гліны і вырабоў з дрэва; апрача гэтаго на выстоўаўцы ёсць вырабы рэмесьленные, і атдзел гістрычны.

Трэба з гары прызнацца, што выстаўка не мае прамысловаго характэру якой павінна была-б быць: на прадажу, апрача рэмесьленных вырабоў, дужа мала чаго ёсць. Найбольш такіх рэчэй каторые не прадаюцца. Але ўсё-ж такі выстаўка склалася цікавая. На выстаўцы ёсць атдзелы губэрній: Віленскай, Мінскай, Могілеўскай, Вітэбскай, Гродзенскай і Ковенскай. Цікава адмечаецца колер экспонатоў (выстаўленых рэчэй) з белларускіх губэрній: перэважывае белы і шэра белы колер з дамешкай чырвонаго і чорнаго; экспонаты с Ковенскай і Гродзенскай губэрній носяць цямнейшы колёрыт.

„Наша Ніва“ зрабіла такжэ свой атдзел на выстаўцы, разам с Пецярбурскай выдавецкай суполкай „Загляне сонцэ і ў нашэ ваконцэ“. „Наша Ніва“ дала на выстаўку найбольш вырабоў старасьвецкіх, суполка, «Загляне сонцэ...» выставіла колькі поўных дзявочых вопратак беларускіх і пару поўных мужчынскіх беларускіх вопратак. Такім парадкам на выстаўцы можна убачыць ня толькі тое, што цяпер вытварае Беларусь, але і тое, што вытварала даўней. І трэба прызнаць, што не на славу цяперэшніх жыхароў выходзіць гэтае прыраўненьне: даўней Беларусь лепей, сціпней умела ўсё зрабіць. У атдзелі Магілёўскай губэрні павешэна колькі ручнікоў у папярэчные палоскі, на некаторых ручніках палоскі чырвоные і белые вузенькіе, на другіх шырэйшые, канцы ручнікоў багата затканы узорамі; у атдзелі «Н. Н.» павешэна колькі старасьвецкіх шырокіх слуцхіх паясоў, тканых гэтак сама у папярэчные палоскі з багатымі рысункамі букетоў кветак на канцах і тут кожнаму кідаецца у вочы, што ня толькі

Ад Дзьвіны і да Прыпеці
Ад Днепра да Бугу вод
Аднэй маткі жывуць дзеці, —
Беларусоў жыве род:

але і тое, што беларусы насяляючы той абшар — гэта патомкі тых самых прадзедоў, каторых рукамі роблены слуцкіе залататканы. Ешчэ ярчэй відаць гэта с часьцей адзежы: с каптуроў, гарсэцікоў і каліт. Вышываные золатам жаноцкіе каптуры с XVII сталецьця маюць блізка тую самую форму, як і сучасные жаноцкіе каптуры з вілейскаго і ашмянскаго паветоў (на выстаўцы гэтых каптуроў набярэцца больш 200 штук), гэтак сама вышываные багата золатам і шытые з золататканоў жаноцкіе гарсэцікі маюць той самы крой, той самы фасон, што і сучасные жаноцкіе і дзявоцкіе гарсэцікі з розных канцоў Беларусі; старасьвецкая шытая золатам і серабром мужчынская каліта такая самая як і сучасная, і гэтак скрозь.. Выстаўка дае многа цікаваго, дагэтуль малавядомаго, многа вучыць, але наводзіць разам і на сумные думкі. Найперш сумна робіцца на душы паглядзеўшы на старасьвецкіе беларускіе выробы, на тканіны, вышыўкі ды параўняўшы тые выробы с цяперэшнімі. Тут ясна можна бачыць да якога упадку можэ найкультурнейшы народ дайсці, калі ён загубляе сьвядомасць сваю націанальную, калі ён мала памалу траціць сваіх правадыроў і культурнікоў. Штукарства, ці як маскалі кажуць „іскуство“—як і літэратура адмечаюць гэты упадак. Вышыўкі і тканіны даўнейшые якіе выраблялiся на Беларусі, рукамі беларускімі, па рысунку і падбору колероў, можна хіба толькі прыраўняць да найдэлікатнейшых тканін і вышывак японскіх. Мала таго: на Беларусі іголка і чаўнок вялі доўгую конкурэнцію с пяром, далатом і пэнзлям: рысункі вышытые іголкай і вытканые чаўнаком не ўступалі найхарашэйшым малюнкам. Умелі вытыкаць і вышываць ня толькі цацкі (орнамэнты) але віды ваколіц і партрэты людзей. Але во, пачала памалу заміраць, не, не заміраць, *а толькі засыпаць* народная душа і разам з ей счэзае памалу вызываная гэтай душой жывая краса. Тое, што наш народ цяпер творыць, гэта толькі грубы успамін старасьвецкаго багацьця! Другая справа каторая не парадуе шчыраго сына Беларусі, гэта тое, што у нас німа прамысловаго духу. Во і цяпер: вялікая выстаўка а на прадажу мала чаго ёсць. Чаму калі у Вялікаросіі, або у Полшчы бывае выстаўка, то там народных выробоў прадаюць ня толькі на тысячы, але на дзесяткі і соткі тысяч. Ці ж мы ўжо такі багаты народ, што нам не патрэбен грош на зваротку у селянскай хаці? Патрэбен, але мы яго ня ўмеем узяць, хоць ён часта-густа

і тут жэ каля нас валяецца. Нам, каб навучыцца працаваць трэба ехаць за морэ, на чужыну, у варункі дзе або памірай з голаду на люднай вуліцы, або бярыся за конскую працу і цягні яе! Не раз мне прыходзілося чуваць ад „амэрыканцоў“, — „што каб так працававаць дома, як я працаваў у Амэрыцы, то б і дома быў-бы той сам заработак“. – І гэта шчырая праўда. Дома кожны з нас звязан праклятым забабонам, перэнятым ад пуста—парожніх людзей, што працаваць стыдна. Што цяжкая праца-ганьба.

Праўда мы цяпер пачалі лечыцца ад гэтаго, але ўсё-ж такі ешчэ ня вылечыліся! Што ня вылечыліся відаць с таго, што ніводнаго не знайшлося чэлавека каторы-бы памкнуўся скарыстаць с такой добрай зручнасьці зарабіць, як выстаўка. Ніхай-бы які ганчар навёз гаршчкоў гладка і сціпна нарабіўшы і ён іх расспрадаўбы ўсе, ніхай-бы які хлапец настругаў цацак і іх бы расхапалі, за добрые грошы, для гарадзкіх дзяцей; каб якая зручная дзяўчына наткала палатна, каб які столяр нарабіў рамак—ўсё б гэта раскупілі людзі. Гэтак сама па нашых гарадох і мястэчках прадаюцца тавары з усіх канцоў сьвету і мы купляем іх; чужынцы прывозяць да нас розную тандэту і забіраюць ад нас золата. Ніхай-бы гэтае золата заставалася у нас. Ніхай бы у мястэчку прадавалі ня тульскіе замкі, кручкі, клямкі і завесы, а каваля с суседняй вёскі; ніхайбы па крамах заместа тандэтных с польшчы кортоў, сатканых з нашых старых паскубаных ануч, прадаваліся б самадзелы акалічных дзеўчат і т д., то ручаюся, што на кожную воласць тысячы рублёў асталося-б у кішані тых самых валашчан, а не паехалі б у сьвет...

Шмат што у нас не ладна дзеецца, але трэба верыць, што усё гэта папpавіцца, трэба працаваць над тым, каб папpавілося, каб было лепей. У апраўданьне нашэ можна сказаць, што доля нас не раздурыла. Што тым як і што народ робіць, ці ўмее ён што рабіць і ці можэ чым зарабляць, інтэлігэнты нашаго краю не так даўно пачалі цікавіцца, дык і дзіва німа, што наш беларускі селянін з аднаго боку ня ведае значэньня выставак, а з другога боку не саўсім верыць у шчырасць інтэлігенцкай помачы. Тым больш што як мы чулі (ці праўда не ручаемся, але як прыказка кажэ: дыму без агня не бывае), тые што збіралі на выстаўку рэчы, збіралі найбольш па панох ды па дварох, а да селян не маглі дaступіцца, бо з імі разгаварыцца па беларуску ня ўмелі. Дзіва ў гэтым німа ніякаго: інтэлігенты доўгіе векі прывыклі не лічыцца з «мужыком» і ня вельмі трудзілі свае дэлікатные мазгі навукай „мужыцкай“ мовы Але цяпер то ўжо ня тое. Колішні „мужык“ *стаўся беларусам*, чэлавекам роўным паміж людзей і ён вымагае пашаны для сябе, сваей мовы і сваей нацыянальнай гордасьці, а да чужакоў — ён чужак. Гэта была абмылка камітэту выстаўкі, але тая вялікая праца па арганізаціі выстаўкі, недахват людзей, агульная санлівасць, і розные нацыональные сваркі многа чаго апраўдываюць. Што камітэт кіраваўся толькі думкай прынясьці карысць краю, на ўходзячы у ніякіе нацыональные сваркі відаць с таго, што ён аднёсся як належало да беларускай мовы: усюды на ўсіх абвестках і на усіх плакатах побач з расейскім, польскім і літоўскім надпісамі пастаўлены надпісі і па беларуску. Трэба прызнаць, што за такі кароткі час і пры такой малой помачы грамадзянства многа удалося зрабіць, болей чымся чэкалі людзі. Устройства выстаўкі каштавала не мала грошы і працы. Кошт на устройства выстаўкі палажыло Віленскае Сельска-гаспадарскае Таварыство, а працы па арганізаціі выстаўкі, вынесла блізка што адна энэргічная асоба п. Кончанка, за што ей чэсць і слава. Добра было б каб нашы чытачы скарысталі і прыехалі каму бліжэй, ці здарыцца зручнасць, аглядзіць выстаўку.

**Экспонэнт.**

## ПАМАЖЫЦЯ!

Усім вядома, што па нашых вёсках, у тые часы чалі было заборонена друкаваць беларускіе кніжкі, хадзілі рукапісные сшыткі з рознымі беларускімі вершамі, сатырамі і паэмамі. Хто іх пісаў і хто шырыў не вядома было. Толькі на ўсякае выдатнае здарэньне у жыцьці народу, у жыцьці грамады, аколіцы, вёскі складаліся вершы і расходзіліся перапісываные з рук у рукі. Рэдакція «Нашай Нівы“ ад самаго пачатку свайго жыцьця старалася збіраць гэту рукапісную беларускую літэратуру і цагэтуль сабралося не мала цэннаго матэрьялу. Побач са збіраньнем рукапісоў нам удавалося выпаўліваць і імёны аўтороў. Аказываецца, што праз усё XIX сталецьця беларускіе пісьменьнікі ня зводзіліся: людзі пісалі і працавалі над развіцьцем беларускай літэратуры, над утрыманьнем беларускай сьвядомасьці. Хоць мы і ведаем колькі імён аўтороў, каторые пісалі па беларуску ў забаронных часах, але па большай часьці людзі гэтые не жывуць ужо і мы ня ведаем хто і што яны былі: не маем іхніх біографій і партрэтоў. А дзеля таго, што гэта справа дужа важная для гісторыі беларускай літэратуры і для увекавечэньня імён безкарысных барцоў за нашу акрадзеную долю, звертаемся да ўсіх нашых чытачоў найперш с паноўленай просьбай збіраць і прысылаць нам рукапісную літэратуру ды запісываць народные паэмы са слоў, а пасьля с прозьбай збіраць і прысылаць у Рэдакцію рукапісы, біографіі (жыцьцяапісаньня), і фотографіі тых аўтороў. Можэ аб кім з іх былі друкаваны якіе весткі, ці партрэты у якіх часопісях, ці кнігах просім такжэ наведаміць нас, а ешчэ лепей прыслаць тые друкі. Патрэбны біографічные весткі аб такіх беларускіх пісьменьніках:

**Арцём Вэрыга Дарэўскі.** Калі радзіўся і дзе, і калі памёр і дзе? Яго жыцьця апісаньне, яго творы. Вядома нам, што Вэрыга-Дарэўскі быў напісаўшы колькі вялікшых паэматоў і перэклаўшы на беларускую мову „Конрад Валенрод“ Міцкевіча. Усе яго паэмы (апрача „Братом Літвіном“, каторай арыгінал знаходзіцца у Рэдакціі „Н.Н.“) не вядомы; родам быў з Вітэбшчыны; жыў ў сярэдзіне XIX ст

**Вінцэсь Коротынскі.** Патрэбна яго біографія, (была друкавана у польскіх часопісях), і яго творы. Пісаў па беларуску не мала. Родам с-пад Вільні, жыў у сярэдзіне XIX ст.

**Якуб Т...кі.** Вядомы нам беларускіе вершы падпісаные гэтым найменьнем Жыў у Могілеві, сучасьнік Вэрыгі Дарэўскаго.

**Ялегі Пранціш Вуль.** Вядомы яго адзін, надта слаўны верш «К дудару Арцёму»... (друкаваны у «Н. Н.»). Жыў у Вітэбску, быў чэлавек незвычайнаго таленту, мову беларускую знаў дужа добра. „Вуль“, можэ быць быў яго псэўдонім.

**Мікалай Короткевіч.** Гэтак сама вядомы нам толькі з аднаго верша пісанаго у Мінску у 1858 гаду.

**Александр Рыпінскі.** Вядомы польскі літэратар 1850-х гадоў. Пісаў і па беларуску. Патрэбна яго біографія, партрэт і беларускіе творы.

**Юльян Ляскоўскі.** Аўтор зборніка вершоў «Białoruski Bandurzysta» (Wilno 1861). Нам казалі бытцым «Białoruski Bandurzysta» сперша быў напісаны па беларуску, а ўжо пасьля пераложэн на польскую мову самім аўторам. З вершаў яго відаць, што ён быў гарачы беларускі патрыот. У адным з сваіх вершоў ён кажэ:

Do nas więc, do nas, wielmożne pany!
A z swojską mową, bo mowa wasza,
Ten jej ton nigdy tam nie słyszany,
Z mogił tych ojce nam powystrasza
I opuścieją nasze kurchany!

..Słowa zmienione w jakoweś grymasy,
W jakieś pod nosem dziwne marmotanie,
Co odpuść Boże, jak złego nasłanie,
Jak wieżę Babel stawia was przy tłumie.
Przy gminie naszym, zrodzonym w tej ziemi,
Przy ludzie prostym, przed bracią młodszemi,
Że człek człowieka zrozumieć nie umie...

На друкаваным экзэмпляру «Biał. Bandurzysty» напісана: «Majej žanie», відаць рукой аўтора. Патрэбна яго біографія, партрэт і творы.

**Хвэлька з Рукшэніц** (Фэлікс Топчэўскі). Пісаў многа па беларуску вершоў. Некаторые надта добрые як «Вечарынка», „Саўсім ня тое што было“, „Гаспадыня“ Жыў у Лепэльскім павеці Вітэбск.

## У ПАНСКІМ ЛЕСІ.

— Ах ты рагатун пракляты! Атлезь, табе кажу, а то. брат, по ўху зловіш, ці ведаеш!

— А стой, не спужаліся. Ды й не карожся дарма, пакуль с табой, як з добраю. Ня хочэш з ласкі, будзе без ласкі!

— Уцекай, падла стары. Мяшок бяры хустку бяры, абдзірай, сабака панскі, а гэткіе жарты пакінь, поскудзь ты!

— А мы во як..

— Ы-ы, не чапай...

Хрась! Хрась!

Забаўтаўся стары лясьнік, пахіліўся, раскярэчыў ногі і саўсім не прыгожа асеў к зямле.

Дрыгнуў шабадранымі ботамі, пацягнуўся.

Чорная, гідкая, страшная кроў паплыла у яго з галавы, пэцкала новы жупан, стрэльбу.

Маладуха астаўпянела, з жаласьці вытрашчыла вочы Тупы шчанель што карэньня капала, шмякнуў з рукі на зямлю.

Ой! Тошна, дрэнна... Німа як аджывіць. Тое ўжо навекі.

Бегч..., бегч.. О-ё-ё-ёй... Што гэта?

Дрэвы нядобра заківалі макоўкамі, прытулілася трава, ледзьве трэснуў сучок, лёгкая болачка уцекла з аднаго боку неба на другі.

Бегла, як шалёная, маладуха.

Лежаў, як калода, стары лясьнік.

**М. Г.**

## ВЫБАРЫ СТАРШЫНЫ.

— Чуеш старая?! Прынясі гарэлкі, трэба каб сягоньня суседзі выпілі за маё здароўе.

Гэтак скончыў сваю доўгую прамову да жонкі Цыпрусь Сысой. Паправіў чырвоную камізэльку і уважна заплікнуў яе стоючы прад кавалкам люстэрка, каторае стырчэло за рамай вакна, прычэсаў вылысеўшую чупрыну, урэшці здаволены сабой пагладзіўся па бруху.

— Чуеш, Праксэда любка мая, старшыной буду! — атсапнуўшыся крыху, пачаў гаманіць, — аб гэтым ужо і вірабьі на страсе свяргочуць, а хлопцы у вёсцы дык ужо сягоньня шапкі перадамной знімалі. Ну — бо і палічы! Пранцісь і Гаронім сідзяць у мяне у кішані, стары Гаўрыла і млынар добра ведаюць, што ніхто ім лепей не памагае, як я, іх галасы гэткіе цэўные, бытцым я іх ужо маю у кішэні. І другіе пададуць галасы на мяне, бо ведаюць добра, што я не дурны. Ох! буду цешыцца калі гэтаго фанабэрыстаго Крываноса скінуць. Во пазелянее тады з зазьдрасьці, як тая рапуха на лета, бо і ён розум мае.

— А ці ведаеш, Праксэдка, што гэта такое старшыны?.. Старшына гэта вялікая галава і вялікая асоба; кожын яго павінен шанаваць. Хай толькі паважыцца які колечы мужык станyць перадамной у шапцы, то ўжо я яго навучыў-бы кудой па табаку хадзіць! А паны і тые будуць выказываць пашану мне. Кожын здалёка ужо скажэ: „дзень добры пане старшына!“ А чхнеш калі небудзь, то ўсе крычаць „на здароўе“. Праўду сказаць клопату с пісаньнем ёсьціка годзі, але затое як добра на бумазі распісацца! Кожын будзе бачыць як я буду распісывацца, пастаўлю: „Цыпрусь Сысой“ а ў нізу чыркну, як пісар закрутушку. А калі чэлавек добра спраўляецца, дык можна дастукацца і якой небудзь медалі. Чэлавек павінен заўсёды быць чыста адзеты, а які такі начальнік прыедзе, то трэба яго і прыняць...

— А грошы у карчме у гарэлцы тапіць,— дасказаза Праксэда са злосьцю, слухаючы доўгую прамову Цыпруся.

— Толькі з гэтаго канца не зачынай,—успакаіваў яе Цыпрусь, — ты якога там рубля не шкадуй. Грошы у нас у запасе ёсць крыху... Лепш паслухай маей думкі! Я хацеў бы штось такога зрабіць для людзей, каб заўсёды успаміналі: „гэта зрабіў Цыпрусь Сысой“. Хай толькі вазьму у рукі воласць! Перва скажу... што скажу?.. ужо маю! Загадаю страху на воласьці памаляваць на сіня, а страху вучылішча на чырвона, каб здалёку было відаць. Над дзьверамі у воласьці скажу напісаць: „Аднавіў і памаляваў пан старшына Цыпрусь Сысой“ А цябе Праксэда, каб усе людзі зналі, прыбяру: куплю табе чырвоную хустку на галаву, а жоўтую акрывацца. То Крываносіха усердзіцца тады!

Апошніе словы Цыпруся крыху унялі Праксэду; яна падышла да яго, папpавіла на ім сьвітку і выпхнула за дзьверы.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

У абшырнай валасной зборні сыйшліся усе валасные бацькі выбраные. Як толькі Цыпрусь перэступіў парог воласьці, пачалі прыгатаўляцца да выбароў. Падняўся гоман, спрэчкі. Цыпрусь увіхаўся, як ўюн у солі, стаў да ўсіх салодкі, як мёд. Сціскаў рукі на права і на лева. З усякім добрым словам абмеяўся. Калі пачалі падаваць галасы, Цыпрусь лічыў свае на пальцах. Пагадзя пісар пачаў чытаць: «Цыпрусь Сысой» і гэтак ешчэ тры разы.

— Піва для ўсіх! — крыкнуў Цыпрусь на усю зборню. Але скора шчасьце адвярнулося. Пісар пасьля чытаў „Савасьцей Крыванос“ і гэтак было да канца.

Цыпрусь бялеў і чырванеў на пераменкі. Выбралі Крываноса.

У гэтым часе падалі піва, каторае заказаў Цыпрусь. „Добра выпіць на бяду“, падумаў

губ. у 1880 гадах, патрэбны матэрялы да біографіі і яго творы.

**Власт.**

(*далей будзе*).

## Стогне пушча.

Дрэме пушча... Ноч глухая,
Цемра легла між галін,
Есць магіла там благая
З даўных памятных часін.
...Тры сястры жылі з сабою
Знаць не ў ласцы, бо адна
З іх пахована з глухою
Пушчай цёмнаю з даўна...
Пушча стогне, над магілай,—
Кветка—краска зацьвіла
Пасьля цемры непрыхільнай
Праўдай с сэрца узыйшла.

Стогне пушча, с трэскам хвоі
Сухастоі гнуцца ў ей...
Во ўсе чары кветкі тоі
Загавор пусьцілі свой..

**Ціліноў.**

## Не гасіце агнеу.

Не гасіце агнёў!.. Хай гараць весялей,
Хай пылаюць іскрыста ў цьме ночы..
Не гасіце агнёў... Хай праменьня ясьней
Асьвечаюць праспаные вочы.

Не гасіце! Бо досі ўжо цьме панаваць —
Ніхай полымя жаркае ўецца...
Ужо дарогу ад цемры пара асьвечаць,
Ўдаль туман ужо рэдкі нясецца

Не гасіце агнёў, пакуль ноч не міне,
Покуль сонцэ зямлі не сагрэе...
І прыгожы дзянёк серабром не блісьне,
Як дарожка жыцьця прасьвятлее!..

**Ал. Гурло.**

## Лепшая рада.

**(у школе).**

„Ну, матулька, роб што хочэш
Ты с сваім Лук'янам, —
Бачыш, во, лабук вялікі
Ровен з бацькам Янам,
Але што, калі лянівы
Дурны, горш ад быдла —
Мне ўжо годзе з ім вадзіцца,
Ды ужо й абрыдла.
Галавой у школе ходзіць,
Стаў хлапец нягодны,
Гдзе пабіта ці разліта—
Лук'ян там нязводны.
Да навукі ён ні здатны,
Толькі да сваволі;
Мусіш браць яго са школы,
Хай ганяе ў полі.
З яго толку век ня будзе,
Кепская з ім рада, —
Стаў спрэчацца ні спаўняе
Майго, бач, загаду.
Ты сама ўжо з ім спраўляйся,
Давай часта лазню; —
Гэта лепш за ўсё паможэ
Кручэнаму блазну!"
—„Мой панок, сьвятую праўду
Кажэш мне у вочы.
А чамуж ты сам тэй лазні
Спробаваць ня хочэш?"
—«Шт..о...ці помніш, што ты кажэш?
Дурні вы абое!»
—«Мой панок, даруй, здаецца,
Яж кажу аб тое,
Што пан ласьне радзіш сыну,
Але добра-б была,
Каб пан так зрабіў, паслухаў
Як бы я прасіла»...
—„Якжэ хочэш? твайго сына
Ніхачу чапаці!
Ты і бацька лепей самі
Спраўцеся у хаці".
—„Не, панок, на што?! ня трэба
З ім нам мардавацца
Ен і так шмат памякчэе
Будзе лепш старацца,
Калі-б пан замест Лук'яна
Ды хлапца другога
Лазой зрэзаў, дык тады-б мой
Прысьмірэў бы многа".

**Альбэрт Паўловіч.**

# З Беларусі і Літвы.

### Выстаўка скаціны у Лебёдцы.

Першаго верэсьня была саргапізавана выстаўка скаціны памешчыкам Іваноўскім у дварэ Лебёдцы, лідзкаго павету. Скаціну прывясьці на выстаўку маглі толькі малазямельные селяне. Дэпартамант Сельскай-Гаспадаркі прыслаў сто руб. нанаграды. На выстаўку прывялі 65 штук скаціны. Ацэншчыкамі скаціны былі выбраны людзі: колькі памешчыкоў, колькі селян і ад Дэпартамэнту прыехаў агроном і вэтэрынар. Скаціна была прыведзена з вёсак: Русакоўцы, Баняке, Збрашно, Алешкаўцы, Галасэніцы, Наумоўцы, Малые Казлэ і з ваколіц: Верхлябёдка і Глебаўцы. Скаціна ня вельмі была добрая, пэўне гэтые вёскі маюць дрэнную пашу. Кароўкі сухенькіе, касьцістые, немяркуючы, як нашы бабы вясковые. Баюся, каб не загневаліся кабеты, але дальбо праўда, надта падобны. Пэўне, што экономічнае палажэньне нашаго краю адзінака адбіваецца як на людзях, так і на скаціні. На выстаўку сабралося шмат народу. На дварэ была павешэна афіша аб цяперашняй выстаўцы у Вільні з беларускім надпісам. Вельмі людзі цікавіліся і некаторые шкадавалі, што ня могуць паглядзець на яе, што гэта не час, калі у Кальварыю ідуць.

Камісія агледзіўшы скаціну пастанавіла 21 штуку наградзіць. Дзьве награды былі па 10 руб., 12 наград па 5 руб., 6 наград па 3 руб. і адна награда 2 рублі. Мэта выстаўкі была тая, каб заахвоціць людзей гадаваць лепшую скаціну. Калі назначалі награды, то глядзелі ня гэтулькі на саму скаціну, але і на тое, сколькі гаспадар мае зямлі. Калі аказывалося, што чэлавек з малым куском і з вялікім лікам скаціны павэдле зямлі, то такому гаспадару ахвотна назначалі награду. У канцы выстаўкі аграном сказаў прамову, у каторай тлумачыў як найлепей, як трэба гадаваць скаціну, ды аб тым якая можэ быць карысць з добрай скаціны. Адна карова добра хаваная можэ даць малака і гною за тры дрэнные каровы. А каб можна было карысьней збываць малако, то трэба злучацца у хаўрус і устроіць супольную малачарню. Ужо у віленскай губэрні ёсць такіе малачарні, каторые вельмі добры даюць даход. Прасіў людзей добра аб гэтым падумаць і калі захочуць, то прыедзе і навучыць як хадзіць каля жывёлы і як з яе карысць дабываць.

Адным словам праектаваў устроіць курсы па малочнай гаспадарцы. П. Іваноўскі абецаўся даць кватэру на гэтые курсы.

**Відавокі.**

### Аб здзітаўцах і да вучыцелёў.

Не раз ужо пісаў я аб Здзітаве, як аб гняздзе пьянства. У апошніе гады манаполька таргуе да 20 тысяч руб. у год, што раскінуўшы на чысло гаспадароў, прыдзецца па 107 руб. у год з гаспадара. А бываюць штукі і цікавейшые ешчэ. Хто паверыць, напрымер, што два здзітаўцы Іван і Рыгор Чайчыцы у тры месяцы прапілі тысячу рублёў. А гэта не мана, а шчырая праўда. Пілі яны пакуль не прапілі амэрыканскіх грошы і, пакінуўшы бяз шэлега сваіх жонак, паехалі ізноў у Амэрыку зарабляць грошы на гарэлку.

26 мая гэтаго году у суседняй вёсцы Горбаво згарэла манаполька і пьянство прыпынілося. Пачухалі патыліцы пьянчугі, што у іх німа атруты, але німа рады. Адзін з іх сказаў: „каб лепей мая ўся будоўля згарэла, а каб лепей асталася манаполька". Тыдні два яны як учадзеўшые хадзілі па вуліцы, аблізываліся і бедавалі, што німа гары. Акцызны чыноўнік і сядзелец натда стараліся, каб наняць хату у Здзітаве пад манапольку, але у гэтае дзела, я пішучый гэтые радочкі, умешаўся, і манапалькі не аткрылі і пьянства прапало. Цяперака на вуліцы ціха, не чутно пасаромных песень, німа боек і пьяных ня угледзіш. Народ саўсім перэмяніўся, зрабіўся ціхім, добрым, лагодным. Буянства (хуліганства) прапало. Маладзеж вядзе сябе спакойна, пьяные бабы не танцуюць па вуліцы і я цяпер не нарадуюся здзітаўцамі. Асталося мне ешчэ завясьці сельскую почту, пазычковы банчок і хаўрусную краму. Загаварываў я з здзітаўцамі аб гэтым, але яны як не развітые і цёмные людзі адно галовы скрабуць, а калі хто што скажэ, то слухаць ня хочэцца. Я ні трачу надзеі, што для іх гэта зраблю і тады магу памерці, бо я ужо маю 60 лет і пара уступіць сваё мейсцо другому малодшаму.

Цяпер звертаюся да малодшых вясковых вучыцелёў:

Вы маладые народные працоўнікі, вазьміцеся шчыра за працу, зближайцеся з народам, дайце яму

---

і сеў за стол, просячы і другіх у кампанію. Піў на убой. Выбраные пачалі расхадзіцца. Наплывалі новые госці. Цыпрусь распачаў гутарку, каторая была па душы яму. Пачалі нарэкаць на старшыну. Усе пілі, елі, а Цыпрусь плаціў.

Даўно ўжо месяц пачаў свой абход панебі, а зоркі зморэные сном заплюскалі вочы, агледзіўся Цыпрусь і устаў з за стала. Нейкіе дзіўные сілы цягнулі яго ізноў на старое мейсцо, але пры помачы гаспадара — карчмара распачаў такі многатрудны шпацар да дзьвярэй. Ногі і рукі былі бытцым з волава, танцаваў па ўсім памосьці. Хацеў сесьці, але ня мог сабе прыпомніць як гэта трэба зрабіць. Махануў рукой на ўсё і пацягнуўся ў старану сваей хаты. Выйшоў на вуліцу і пачаў ісьці. Але дзіва! Хаты перад ім пачалі вельмі скора перэбегаць, бытцым танцавалі мяцеліцу. Колькі разоў бачыў падскаківаючую сваю хату, але да дзьвярэй ня мог трапіць. Пачэкаў крыху і як хата ізноў стала перэбегаць, ня сцярпеў і з усей сілы кінуўся у дзьверы. З разгону уваліўся у хату. Глуш была кругом, усе спалі, радый з гэтаго пасунуўся на пальцах да сваей пасьцелі. Сцягнуў боты і схаваў пад ложка. Зняў камізэльку і сьвітку і павесіў на цьвяку каля ложка і узлез на пасьцель. Выдалася яму пасьцель бытцым крыху за цьвёрда, вузка і нeяк нізка, але пагадзіўшыся з гэтым усім заснуў.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Сонцэ ужо высока было, калі Цыпрусь збудзіўся. Глянуў і адзірвянеў. Над галавой яго пахінулося колькі чэлавек і голасна сьмеяліся. У першы момэнт ня ведаў што гэта дзеецца, але працёр вочы і крануўся с пасьцелі. І тады убачыў.

Спаў ён у загарадцы для сьвіней на падворку ворага свайго, старшыны Крываноса Апратка вісела на плаце, а боты стаялі пад лаўкай на каторую стаўлялося карыто с сьвінной ядой і ў каторым ён праспаў усю ноч. Кругом стаялі хатніе Крываноса і сьмеяліся. Скочыў Цыпрусь на роўные ногі, схапіў апратку і боты, каторые ужо парасяты усьпелі абгрызьці, і давай уцекаць дамоў.

Як яго там Праксэда прыняла лепш не пісаць. Але ўжо пэўна, што другі раз у старшыны масьціцца Цыпрусь ня будзе.

**Язэп Ш—т.**

## Летнім днем.

I

Цівік, цівік! закрычала ластавачка і за ею усе птушачкі пачалі варушацца і брацца за работу — хто гнёздачка кончыць, хто дзетак карміць, а хто і летаць вучыць. Зашастаў цяжкімі крыльлямі бусел і апусьціўся на роснае балота. Плюсь, плюсь, плюсь! адна за другою жабы ў ваду, каб не папасьці у бяду і мінуту прамаўчаўшы ізноў давай вывадзіць на ўсе лады свае сьпевы бытцым-бы дражнючы бусла, што яны, яго не баяцца. Захад усё чырванее чырванее і паказываецца ў рэшці вялікае агністае сонейко. Усё заварушылося, усе узяліся за працу.

II

Са-ка са-ка са-ка са-ка раздалося у паветры, а посьле чутно цс-сык, цс-сык, цс-сык і чэлавек дваццаць здаровых мужчын з ахвотаю касілі густую і сочную траву. Незадоўга шнур іх разцягнуўся і кожын, не сьпешаючы, памаленьку падступаў ўперад.

Сонейко паднялося ужо вышэй, зрабілося меншым, а заместа харашыні якая была расласцерта на балоці, відаць толькі радочкі скошэнай травы. Пахата падвяўшых кветак разнеслася у паветры, і здавалося запоўніла ўвесь сьвет.

III.

На змену касцом прышлі паўгледацца на кветкі дзеўчаткі з граблямі і відаць што каждая уздыхнула, што ня будзе больш у гэтым року такой харашыні і ня будуць яны плясьці вянкоў з медуніцы. Стаўшы адна каля аднае пашлі яны гуляць грабелькамі па балоці і здавалося што гэта не дзяўчаткі, а тые белые русалачкі пра каторых нам матуля маленькім разказвала

Як толькі пакончылі раскідаць па першым пракосе і занялі ад лесу па другім, перэсталі штосць гаварыць так як змовіўшыся. Але зара тосць папробаваў крыкнуць ці ёсць гук, за ім другі, трэйці і паглядзеўшы што лес паўтарае іх голас, разам завялі песьню. І палілася яна чыстая, бязмерная, як рэка, а лес і ўсе птаства услухалося у гэту харашыню.

Той самы, цяжкі бусел, а з ім і яго сябры падняўшыся пад абалокі плавалі як пернікі, услухаліся у гэту песьню і радаваліся з летняго дзянёчка.

**А. Язьмен.**

